ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 98 (1367) СЕРАДА, 29-га красавіка 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80
1 год . . . 3 р. 60
АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сакратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.
Кошт асобнага №—2 кап.

1-ае мая—дзень патрабаваньняў працоўных Нямеччыны

БЭРЛІН, 23. Эўрапэйскі сялянскі камітэт і прымыкаючыя да яго рэволюцыйныя камітэты працоўнага сялянства асобных краін выпусьцілі першамайскія адозвы.

Адозвы прапануюць ўсім працоўным сялянам неадкладна распрацаваць свае запатрабаваньні і дагаварыцца з рэволюцыйнымі рабочымі організацыямі аб уключэньні гэтых запатрабаваньняў у першамайскія лёзунгі.

Акрамя гэтага, адозва заклікае сялян ператварыць Першае Мая ў вёсках і мястэчках у дзень барацьбы за сялянскія запатрабаваньні, а таксама за запатрабаваньні рабочых.

Масавы рух мільёнаў

Два гады раней, 29-га красавіка 1929 году, XVI-я ўсесаюзная партыйная канфэрэнцыя ў сваёй адозве аб разгортваньні соцыялістычнага спаборніцтва сказала:

„Соцыялістычнае спаборніцтва, якое ўвесь час разгортваецца, зьявіцца адной з лепшых гарантый таго, што на падставе генэральнай лініі партыі пяцігадовы плян гаспадаркі будзе выкананы“.

Мінула два гады. Гэта былі гады напружанай, упартай барацьбы за выкананьне 5-цігадовага пляну ў найкарацейшы час. Гэта былі гады ўпартай барацьбы з усімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі, непрымірымай барацьбы з правым опортунізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, „левымі“ загібамі і прымірэнцкімі адносінамі да іх.

Толькі ў гэтай барацьбе, пры правільным і паслядоўным правядзеньні генэральнай лініі партыі, маглі быць дасягнуты і былі дасягнуты нашы посьпехі.

Другая гадавіна соцыялістычнага спаборніцтва адбываецца ў той час, калі пролетарыят Савецкага Саюзу з бальшавіцкай напорыстасьцю змагаецца за выкананьне народнага гаспадарчага пляну 3-га, рашаючага году 5-цігодкі.

Выкананьне 5-цігодкі ў 2 з паловай гады па раду галін прамысловасьці сьведчыць аб тым, што намечаныя пляны будуць не толькі выкананы, але і перавыкананы. 3-ці год павінен даць новых, пабудаваных на прынцыпах найноўшай тэхнікі, 518 фабрык і заводаў, новых 1.040 машынна-трактарных станцый, тады, як за мінулыя 4 гады было пушчана ў ход толькі 323 прадпрыемстваў, а да 29 году была толькі адна машына-трактарная станцыя.

Уваходзячы ў 3 год разгортваньня соцыялістычнага спаборніцтва, мы падводзім вынікі дасягнутыя намі за мінулыя два гады. Соцыялістычнае спаборніцтва выявілася ў мностве рознастайных канкрэтных форм, якія сапраўды ператварылі „працу з цяжкага і ганебнага цяжару, якім яна лічылася раней, у справу гонару, у справу славы, у справу мужнасьці і гэройства (Сталін).

Масавы рух соцспаборніцтва выліўся ў арганізацыю ўдарных брыгад, стварэньне скразнога конвэеру ўдарнікаў, правядзеньне вытворчых манэўраў. Ленінскі лёзунг спаборніцтва за мінулыя два гады аброс мясам канкрэтных спраў сапраўднай бальшавіцкай практыкі.

З фабрык і заводаў рух перакінуўся на колгасныя палі. Соцспаборніцтва становіцца магутным вагаром у соцыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі. Соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва пранікае ўсе галіны нашай працы. Няма і не можа быць ніводнай галіны і ўчастку нашага будаўніцтва, не ахопленага соцыялістычным спаборніцтвам.

Далейшае разгортваньне соцыялістычнага спаборніцтва павінна ўзьняць яго на вышэйшую ступень пры непасрэднай сувязі з барацьбой за ўладаньне навукай і тэхнікай, барацьбой за разгортваньне рабочага ізабрэтальніцтва, рацыяналізатарскага руху і паляпшэньне якасьці продукцыі.

Ініцыятар соцыялістычнага спаборніцтва—Ленінскі комсамол абавязаны і на далейшы час змагацца за разгортваньне спаборніцтва.

Новым масавым разгортваньнем ударніцкага руху, новымі ўдарнымі брыгадамі імя 518 і 1040 пролетарыят сустракае другую гадавіну соцспаборніцтва.

Пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі гіганцкія пляны соцыялістычных работ будуць выкананы.

Ні арышты, ні провокацыі не перашкодзяць працоўным сьвяткаваць 1-ае Мая

Рабочая дэлегацыя з Брусэля едзе ў Маскву

ПАРЫЖ. 26. На першамайскія ўрачыстасьці ў Маскву выяжджае з Брусэля рабочая дэлегацыя, арганізаваная таварыствам прыхільнікаў СССР.

Прадмайскія арышты

БЭРЛІН. 23. Як паведамляе друк, учора ахранка арыштавала трох новых комдэпутатаў Рыскае гарадзкое думы.

Арышты зроблены з мэтай сарваць першамайскую дэмонстрацыю рэволюцыйных рабочых. Комуністычныя дэпутаты арыштаваны таксама ў Віндаве і Лібаве.

Нячуваная провокацыя нацыянал-фашысцкага ўраду

БЭРЛІН. 23. Як паведамляе комуністычная „Гамбургер фолькс цэйтунг“, к 1-му Мая ў Гамбург адпраўляецца некалькі мінаносцаў, якія будуць у баявой гатоўнасьці дзяжурыць у гавані.

Спэцыяльная пасылка ваенных караблёў у Гамбургскую гавань наладжана ў сувязі з першамайскімі дэмонстрацыямі і зьяўляецца нячуванай провокацыяй, накіраванай супроць рэволюцыйных рабочых.

Выстаўка савецкіх тавараў мае вялікі посьпех

ТЭГЕРАН. 23. Выстаўка машынага абсталяваньня, якое вытвараецца ў СССР і тавараў, што ўвозяцца ў Пэрсію з Савецкага Саюзу, мае вялікі посьпех.

Друк удзяляе выстаўцы шмат увагі.

Ангельскі ўрад адмаўляецца прыняць францускія прапановы

РЫМ. 27. Друк паведамляе, што адказ ангельскага ураду на францускую ноту ад 22 красавіка з умовамі англа-франка-італьянскіх морскіх перагавораў паведамлены таксама і італьянскаму ўраду:

На словах газэт, ангельскі ўрад адмаўляецца прыняць новыя францускія прапановы, у якіх Францыя выражала гатоўнасьць захоўваць у сіле, прадугледжаныя згодай абмежаваньні да 1-га студзеня 1934 году і тым чынам Францыя змагаецца выбіцца за межы вызначанага ёй тоннажу толькі на працягу 1935 году.

Нанкін мобілізуе сілы супроць чырвоных

ПЭЙПІН. 27. Нанкін мобілізуе свае сілы для барацьбы з чырвонымі часткамі. У провінцыі Янцзы нанкінскі ўрад сконцэнтраваў вельмі значныя сілы.

Перамога чырвоных частак

ПЭЙПІН. 27. Нанкінскія войскі пад камандай Ван-Чын-Юса панярнелі сур'ёзнае паражэньне ў бойцы з рэволюцыйнымі войскамі. Блізу Альфу, провінцыя Янцзы, Ван-Чын-Юс страціў калі дывізі.

Рэволюцыйныя войскі, што апіраюцца ў Янцзы, прасоўваюцца па поўдні провінцыі Хувань, як відаць, намер далучыцца да рэволюцыйных войск, якія апіраюцца ў Хубэйскай провінцыі.

100.000 ненадзейных элемэнтаў у фашысцкай партыі Італіі

БЭРЛІН. 22. Як паведамляе лева-пролетарская „Вэльт ам абэнд“ з Лугано (Італія), генэральны сакратар фашысцкай партыі Італіі—Гураці ў адным з апошніх выступленьняў заявіў, што фашысцкая партыя выключыла ў апошні час з сваіх радоў 100.000 членаў, „як ненадзейны элемент“.

Першамайскія лістоўкі распаўсюджаны

ПЭЙПІН. 27. Паліцыя канфіскавала першамайскую лістоўку, выпушчаную компартыяй.

Аднак, паліцыі ўдаецца забраць толькі нязначную колькасьць экзэмпляраў, асноўная маса экзэмпляраў ужо была распаўсюджана.

„Заваюем першае месца ў сьвеце—пераганім Амэрыку“

МАСКВА. Усесаюзны зьезд нафтавікоў прыслаў у адрас ЦВК СССР т. Калініну і СНК СССР—т. Молатаву прывітальную тэлеграму.

Узнагароду 90 гэрояў вышэйшай узнагародай пролетарскай краіны—гаворыцца ў тэлеграме—мы расцэньваем, як прызнаньне выключных заслуг усіх пролетараў нафтавікоў. Запэўніваем урад, што выканаем пяцігодку ў два з паловай гады, мы не супакоімся на дасягнутым. Задачы пастаўленыя 6 зьездам саветаў, ня больш, чым у 10 гадовы тэрмін дагнаць і перагнаць перадавыя капіталістычныя краіны—мы ажыцьцявім куды хутчэй. Уперадзе нас толькі Амэрыка. Пад кіраўніцтвам партыі і ўраду, акрыленыя падтрымкай усёй краіны, разьвіваючы соцыялістычнае наступленьне, мы ў бліжэйшыя гады заваюем першае месца ў сьвеце—пераганім Амэрыку. Няхай жыве дыктатура пролетарыяту. Няхай жыве савецкая ўлада! Няхай жыве партыя Леніна!“

Узмацніць фронт баявога інтэрнацыяналізму

МАСКВА. Цэнтральны камітэт МОПР СССР у першамайскім звароце да ўсіх працоўных Савецкага Саюзу заклікае іх організаваць шырокую дапамогу барацьбітом сусьветнай рэволюцыі, ахвярам белага тэрору, умацоўваць фронт баявога інтэрнацыяналізму, ўступіць у шэрагі МОПР'у.

Усе сілы на ажыцьцяўленьне задач 3-га году пяцігодкі!—гаворыцца ў звароце.

На рэволюцыйную барацьбу заграніцнага пролетарыяту адкажам ударніцтвам і соцыялістычным спаборніцтвам на ўсіх франтох будаўніцтва соцыялізму.

Памятайце, Савецкі Саюз—ударная брыгада міжнароднага пролетарыяту. Завяршэньне будаўніцтва фундаманту соцыялістычнай эканомікі СССР набліжае перамогу соцыялізму ва ўсім сьвеце.“

Паведамленьне „Ньюс Кронікль“

ЛЁНДАН. 12. Газэта „Ньюс Кронікль“ паведамляе, што Лойд Джордж, магчыма, наведае СССР у верасьні. Газэта піша: „Лойд Джордж вельмі цікавіцца пяцігадовым плянам і жадае ўласна азнаёміцца з яго вынікамі і правядзеньнем у жыцьцё“.

ПАДРЫХТАВАЦЦА ДА СЬВЯТА ЧЫРВОНАГА СПОРТУ*)

23-га ліпеня гэтага году адбудзецца 10-цігодзьдзе баявага міжнароднага аб'яднаньня рабоча-сялянскай спартыўнай організацыі ЧСІ, а 4 ліпеня праводзіцца ў Бэрліне інтэрнацыянальная спартакіяда.

Чырвоныя спортсмэны—барацьбіты за дыктатуру пролетарыяту

Для буржуазіі фізкультура і спорт зьяўляецца сродкам абароны капіталістычнага ладу, зброя прыдушэньня рэволюцыйнага руху, сродкам для адцягваньня ўвагі працоўных ад клясавай барацьбы, сродкам для падрыхтоўкі новых імпэрыялістычных войн, у асаблівасьці супроць СССР.

Фашысцкія ўрады, сумесна з соцыял-фашысцкімі правадырамі спортруху, вядуць самую жорсткую барацьбу супроць рэволюцыйнага руху, аднаго са сродкаў мобілізацыі шырокіх працоўных мас на барацьбу супроць міжнароднай буржуазіі, за ўстанаўленьне дыктатуры пролетарыяту.

Буржуазія ў апошні час ужыла захады, каб падпарадкаваць усе спортыўныя організацыі буржуазнай дзяржаве. У радзе краін (Францыя, Юга-Славія, Польшча, Румынія і інш.) праведзены адпаведныя законы, на падставе якіх у гэтых краінах ніводная спортыўная організацыя ня можа існаваць, калі яна не знаходзіцца пад кіраўніцтвам таго ці іншага міністэрства, альбо спэцыяльных урадавых камітэтаў.

Лязо гэтага мерапрыемства галоўным чынам накіравана супроць рэволюцыйнай спорторганізацыі пролетарыяту, якая пад кіраўніцтвам комуністычных партый разгортвае работу для ўстанаўленьня дыктатуры пролетарыяту.

Афіцэры запасу—кіраўнікі і інструктары спорторганізацый

Побач з падпарадкаваньнем фізкультурнага руху буржуазіі, фашысты ствараюць вакол сябе масавыя спортыўныя організацыі, ставяць іх у поўную залежнасьць ад фашызму і скарыстоўваюць як рэзэрв для папаўненьня сваіх атрадаў.

Акрамя гэтага, буржуазія шырока скарыстоўвае фізкультуру з мэтай ваенізацыі насельніцтва, яна робіць спорт адным з сродкаў па-за вайсковай падрыхтоўкі шырокіх мас насельніцтва.

Па меры росту пагрозы новых імпэрыялістычных войн і асабліва вайны супроць СССР вайсковыя міністэрствы ўсіх буржуазных дзяржаў імкнуцца зрабіць спорт цалкам залежным ад агульных пляваў падрыхтоўкі вайны. З гэтай мэтай афіцэры запасу прызначаюцца кіраўнікамі і інструктарамі спорторганізацый. З каштарысаў ваенных міністэрстваў адпушчаюцца вялікія сродкі для ваенізацыі спорту, а паасобныя спортсмэны якія пасьпяхова праходзяць курс ваенізацыі у спортыўных клюбах, атрымоўваюць значныя ільготы па вайсковай службе. Буржуазія скарыстоўвае спорт для барацьбы супроць рэволюцыйнага профэсыянальнага руху, для таго каб стварыць кадры штрэйкбрэхераў.

Масавасьць—асноўная задача спортыўных організацый

Чырвоны Спортінтэрн, які сьвяткуе 10 год існаваньня, як масавая рэволюцыйная спортыўная організацыя зьвязаны ў сваёй рабоце выключна з організацыямі пролетарыяту, і праводзіць непрымірымую барацьбу з буржуазіяй.

Чырвоныя спорторганізацыі працуюць рука аб руку з Комінтэрнам. Чырвоным Профінтэрнам, КІМ'ам, МОПР, ам, Сялянскім інтэрнацыяналам і іншымі рэволюцыйнымі організацыямі.

Савецкая фізкультура ёсьць перадавы атрад міжнароднага рэволюцыйнага спортруху. Гэта накладае вялікую адказнасьць на фізкультурнікаў Савецкага Саюзу за разьвіцьцё рэволюцыйнага спорту ва ўсім сьвеце.

Чырвоны спортыўны рух уступае ў фазу яшчэ больш жорсткай клясавай барацьбы.

Зараз перад Чырвоным Спортінтэрнам стаяць асноўныя задачы: павялічэньне пролетарскага ядра, сыстэматычная барацьба супроць буржуазнага спортруху і рэформісцкага спорту, выкрыцьцё балбатні і хлусьні аб пазаклясавасьці спорту соцыял-дэмократаў, якія зьяўляюцца асноўнай соцыяльнай апорай буржуазіі.

На аснове тактыкі адзінага фронту зьнізу, рабочым спортыўным організацыям неабходна адваяваць рабочых спортсмэнаў, якія знаходзяцца яшчэ ў буржуазных спортыўных саюзах. Распрацаваць новыя формы прыцягненьня ўсіх рабочых у чырвоны спортрух. Асноўная задача сёньнешняга дня—заваяваць новыя тысячы і мільёны рабочых спортсмэнаў, разгарнуць шырокую барацьбу за масавасьць чырвонага спортруху.

Посьпех у выкананьні гэтых задач у значнай ступені залежыць ад таго, наколькі ЧСІ, яго сэкцыі і рэволюцыйна-пролетарскія організацыі наладзяць працу, асноўваючыся на правераным вопыце клясавай барацьбы.

Далейшыя задачы ўсіх рабочых спортыўных організацый у тым, каб у бліжэйшы час перанесьці цэнтр цяжару на вытворчасьць, на фабрыкі і заводы, разгарнуць работу сярод рабочых спортсмэнаў усяго сьвету каб ліквідаваць люцэрнскі інтэрнацыянал, як масавую буржуазную спортыўную організацыю і перайсьці ў больш рашучае наступленьне на буржуазна-„мілітарысцкі“ спортыўны рух, дабіваючыся заваёў большасьці рабочых спортсмэнаў, асабліва фабрычна-заводзкіх колаў.

З. Трасkоўскі.

*) Працяг у наступным нумары.

МАРШРУТ НА ПРАВА НОВЫХ ПЕРАМОГ

Колгас „Бязбожнік“ ліквідаваў абязьлічку, перайшоў на зьдзельшчыну і абвясьціў да другой гадавіны соцспаборніцтва набор ударнікаў імя „Чырвонай Зьмены“, „518 і 1040“

Вопыт колгасу „Бязбожнік“ павінен стаць здабыткам усяго комсамолу

Сёньня мы даем матар'ялы спэцыялізаванай брыгады „Чырвонай Зьмены“ аб колгасе „Безбожнік“ Лёзьненскага раёну. Гэты колгас „Чырвоная Зьмена“ ўзяла для вопытна-дасьледчай работы. Сюды будзе перададзены лепшы вопыт організацыі працы і вытворчасьці колгасу „Гігант“ імя „Комсомольскай праўды“ (Украіна).

У гэтым колгасе мы ўвялі для ажыццяўленьня два мерапрыемствы: ліквідацыю абязьлічкі і ўвядзеньне зьдзельшчыны.


Сёньня колгасьнікі расказваюць аб сваіх дасягненьнях.

Гетыя дасягненьні выражаюцца перш за ўсё ў тым, што колгас у сваёй рабоце перайшоў на вышэйшую ступень організацыі працы. Асабліва паказальна тое, што ўся маса колгасьнікаў уцягнута ў абгаварэньне вытворчых пытаньняў. А гэта мае вялізарнае значэньне.

Мы колгасу дапамаглі конкрэтызаваць вытворчы плян, ліквідаваць абязьлічку.

Акрамя гэтага, колгас організаваў вярбовачную брыгаду, якая за адзін вечар уцягнула ў колгас 20 аднаасобнікаў.

Гэты вопыт колгасу „Бязбожнік“ павінны ажыцьцявіць усе колгасы і ячэйкі ЛКСМБ.



Тэмпаў затрымліваць нельга

Мы колгасьнікі колгасу „Бязбожнік“ зварочваемся да ўсіх колгасьнікаў і аднаасобнікаў БССР.

Бальшавіцкая вясна 3-га рашаючага году 5-цігодкі патрабуе, каб мы па-баявому ўзяліся за выкананьне заданьняў севу, максімальна скараціўшы тэрміны. Гэта значыць набудаваць усю працу па-ўдарнаму. Мы даем 40 новых ударнікаў „Чырвоназьменаўскага набору“ імя „518 і 1040“. Усю работу перавялі на зьдзельшчыну, ліквідавалі абязьлічку ўсіх зьвеньнях нашай работы, што дало вялізарныя дасягненьні.

Зьдзельшчына і ліквідацыя абязьлічкі ўзьнімуць працу колгасаў на яшчэ большую вышыню. Але ня ўсе яшчэ колгасы зразумелі, якую вялізарную ролю адыгрывае ўвядзеньне зьдзельшчыны і ліквідацыя абязьлічкі.

Таварышы! Вазьмецеся зараз-жа, па-баявому, за ўвядзеньне зьдзельшчыны, за ліквідацыю абязьлічкі, перабудуйце сваю работу літаральна на працягу гадзін.

Памятайце, што ў гэтую весну нам прыдзецца працаваць асабліва напружанымі тэмпамі. Тэмпаў затрымліваць нельга.

„Затрымаць тэмпы г. зн. адстаць, а адсталых бьюць. Але мы ня хочам быць бітымі.“ (Сталін).

Таварышы аднаасобнікі, уставайце побач з намі змагацца за бальшавіцкую вясну, за сканчэньне пабудовы фундамэнту соцыялістычнай экономікі ў 3-м рашаючым годзе 5-цігодкі. Перад вамі адзін шлях—шлях колгасаў. Рапартуйце Першамаю аб вашых дзеяньнях. Мы чакаем ад вас адказу, што вы практычна зрабілі для організацыі моцнага колгаснага прыліву для ўвядзеньня зьдзельшчыны і ліквідацыі абязьлічкі. Адказвайце:—мы чакаем!

Агульны сход колгасьнікаў колгасу „Бязбожнік“, Унаўскага с-савету Лёзьненскага раёну.

Правільная расстаноўка сродкаў і сіл—парука бальшавіцкіх перамог

Наш колгас „Бязбожнік“ мае ў сваім складзе 115 двароў, 52 рабочых коняй, 82 каровы, 27 штук маладняка, 22 цялят, 43 аўцы, 3 ягнят, 38 сьвіней, 21 парасё. Ворнай зямлі 880 га, а разам з сенакосамі, лесам і г. д.—1500 га. У нашым колгасе 8-мipольны севазварот. У гэтым годзе па пляну сеем: 200 га лёну, 150 га аўса, 20 га ячменю, 60 га бульбы, 6 га яравой пшаніцы, 30 га лугавых траў, 27 га караньплодаў, 10 га сілосных культур, 17 га гародніх культур, 6 га канапель, 60 га мешанкі (віка за аўсом), 20 га чорнага папару, 5 га гароху, 44 га канюшыны на насеньне, 84 га канюшыны на сена.

Трактары МТС павінны ўзараць па пляну 470 га, рэшту ўзарэм коньмі. Для гэтых работ складаем брыгады: 3—па ворцы, 1—сяяльшчыкаў, 1—баранавальшчыкаў, 1 па пасадцы бульбы, 1 па пасадцы гародніх культур.

Усю работу мы перавялі на зьдзельную аплату з улікам ў працаднёх. Для падвышэньня працдысцыпліны, паменшаньня страт, амортызацыі інвэнтара мы ліквідавалі абязьлічку.

Араць у першую чаргу будзем пад лён, авёс, ячмень, потым і пад іншыя культуры. Усе брыгады ў нас спэцыялізаваны. З прычыны кліматычных умоў (вільготнасьці глебы) дзён 3-5 прыдзецца толькі араць, каб глебе даць падсохнуць, потым ужо можна будзе прыступіць да баранаваньня і севу. Адну брыгаду аратых пасьля мы расформіруем і ўтворым з яе брыгады сейбітаў і баранавальшчыкаў. Астатнія брыгады будуць араць да канца.

Каб выканаць плян пасеўнай кампаніі патрэбна 30 дзён. Мы скарачаем тэрмін пасеву на 5 дзён, г. зн. усю работу павінны скончыць за 25 дзён. Для такіх напружаных тэмпаў патрэбен выразны вытворчы плян з такім разрахункам, каб кожная брыгада ведала, дзе і што яна будзе рабіць і колькі дзён патрэбна ёй на дадзеную работу.

Мы календарызавалі вытворчы плян вясновых работ наступным парадкам: поле № 1. Усяго ворнай зямлі 110 га. Сёлета будзе сеяцца 32 га лугавой аўсянкі, 22 га ячменю, рэшта плошчы занята азімымі і канюшынай. Брыгада № 1 працуе пры наяўнасьці 8 плугоў, 16 коней, 8 дарослых рабочых і 8-мі падлеткаў. Работа павінна быць скончана ў 10 дзён, пасьля брыгада № 1 пераключыцца на поле № 4. Гэта поле мае ворнай зямлі 113 га, сеецца віка-аўсяная мешанка 60 га, пад чорны папар—20 га. Работа павінна быць скончана за 18 дзён.

Поле № 2-3

Усяго ворнай зямлі 230 га, з іх засяваецца: ільном—94,50 га, 3 га караньплодамі, 4 га бульбаю, 2 га сіласнымі культурамі. Працуюць трактары № 14 і 15 і брыгада № 3 пры 8 плугах, 16 конях, 8 падлётках, 8 колгасьніках. Работа павінна быць скончана за 8 дзён. Пасьля гэтай работы брыгада пераключаецца на поле № 6.

Поле № 6 мае 111.50 га ворнае зямлі. Сеецца ў гэтым годзе 85,50 га лёну. Працуюць трактары № 16 і 17 і брыгада № 3. Работа павінна быць скончана за 10 дзён.

Поле № 7

Усяго пахаці 108 га. Будзе сеецца 50 га аўса, 20 га лёну, 5 га гароху, 4 га бульбы і 3 га караньплодаў. Працуе брыгада № 2, маючы 12 плугаў, 24 коняй, 12 колгасьнікаў і 12 падлеткаў. Работа павінна быць скончана за 15 дзён, Насьля брыгада пераключаецца на пасадку бульбы: поле № 5.

Поле № 5

Ворнае зямлі 115 га, з іх адводзіцца 52 га пад бульбу, 24 га пад караньплоды, 17 га пад гароднiну. 8—пад сілосныя культуры і 8 га пад каноплі. Працуюць трактары № 16 і 17 на працягу 13 дзён, а потым пераключаецца на поле № 8.

Тут будзе сяецца 105 га аўса.

Працуюць на працягу 12 дзён трактары № 16 і 17.

Да другой гадавіны соцспаборніцтва організавалі заклік ударнікаў „Чырвонай Зьмены“ „518 і 1.040“

Мы, колгасьнікі колгасу „Бязбожнік“ Унаўскага с-савету, Лёзьненскага раёну ў колькасьці 40 асоб, абвяшчаем сябе ўдарнікамі „Чырвоназьменаўскага“ набору колгасьнікаў у рады ўдарнікаў імя „518 і 1.040“.

Мы абавязваемся:

Не рабіць прагулаў і працаваць бяз выхадных дзён і ў сьвята.

Максымальна выкарыстаць с-г. інвэнтар, цягавую і рабочую сілу.

Прастоі коняй, інвэнтара зьвесьці да нуля.

Падняць вытворчасьць працы на 15 проц.

Павесьці барацьбу са стратамі ў вытворчасьці.

Абвясьціць унутрыколгасны рацыяналізатарскі паход колгасьнікаў.

Дзьве гадзіны ў дэкаду займацца ліквідацыяй агротэхнічнай няпісьменнасьці.

Тэрміны веснавой пасеўнай кампаніі скараціць на 5 дзён.

40 подпісаў новых ударнікаў.

Як мы расставілі свае сілы

Мы з дапамогай „Чырвонай зьмены“ ліквідавалі абязьлічку, да вясеньніх работ далі нарад кожнаму колгасьніку, прымацавалі да кожнага інвэнтар і коняй, за якія ён будзе адказваць і ў спраўнасьці іх будзе зацікаўлены.

Усю работу мы перавялі на зьдзельшчыну з улікам у працаднёх.

Організацыю брыгад і расстаноўку сіл мы правялі наступным чынам:

СКЛАД БРЫГАД

Брыгада № 1. Брыгадзір—ВОРАНАЎ МІКОЛА

			Плуг
1. Зэльцін Паўлюк	—прымацаваны коні:	Чандэра Якава і Шэлгунова	№ 1
2. Праворны Карл	„	Дземянава і Іванова	№ 2
3. Лахвенка Мікола	„	Балціна Сівага і Грушу	№ 3
4. Воранаў Мікола	„	Казлоў Антон	№ 4
5. Селязьнёў Цiт	„	Сігэра і Оліна	№ 5
6. Хадзюкоў Зьмітрок	„	Аляксеева і Брэмшмідта	№ 6
7. Аляксееў Мікола	„	Грэнчынка і Белкіна	№ 7
8. Гапанкоў Рыгор	„	Чандэра і Сівалобчыка	№ 8
		Чандэра і Гапанкова	№ 8

Брыгада даярак

1. Лечанкава Е.
2. Агнісцікава Э.
3. Шаірка А.
4. Сівалобчык Э.
5. Гейзін Л.
6. Каралёва А.
7. Каралёва Н.

Ля цялят:

1. Каралёва А. В.
2. Азоліна В.

Ля авечак

1. Каралева А. В.
2. Каралёў Восіп

БРЫГАДА № 4. Сейбіты

Брыгадзір—Макарэнка Алесь

1. Лаўрэнцеў Н.
2. Фадзееў А.
3. Нікаронаў Захар
4. Несьцераў Даніла
5. Тураўскі Пётра
6. Бот Ф.
7. Боер Алесь
8. Агнісцік Ягор.
9. Макарэнка Алесь

БРЫГАДА № 5. Баранавальшчыкі

Брыгадзір—Салаўева Марфа

1. Каралёў Пётра
2. Краўцоў Міхась
3. Казлоў Антон
4. Салаўёў Іван
5. Нікапораў Міхась
6. Казлова Марыля
7. Хадзюкова Эмілія
8. Салаўёва Марыля

Па сьлядох гісторыі

(1918—1921 год)

Да 10-цігадовага юбілею „Чырвонай Зьмены“

Гісторыя комуністычнага юнацкага друку на Беларусі зьяўляецца разам і гісторыяй ЛКСМБ, гісторыяй з багатай, многагранней барацьбою. Гэта гісторыя тым больш важна, тым больш заслугоўвае ўвагі, што яна—выразны і жывы малюнак росту і жыцьця комсамолу—ўяўляе сабою згрупаваны вопыт вялікай творчай і героічнай барацьбы пролетарскае моладзі пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі за дыктатуру пролетарыяту.

Утварыць свабоднае панаваньне працы...

Формаваньне Ленінскага Комсамолу Беларусі, яго месца ў барацьбе і органічнае замацаваньне на ўсіх этапах разьвіцьця асабліва зараз цікава прагледзець. Цікава, бо Беларусь, пасутнасьці ў дні грамадзянскае вайны зьяўлялася арэнай вялікіх клясавых боек. Успомнім нямецкіх окупантаў, якія з першых-жа дзён пролетарскай рэволюцыі захапілі большую частку Беларусі, за імі Пятлюру, балахоўцаў, белапанскую Польшчу і, нарэшце, розныя белабандыцкія атрады, што гойсалі па Беларусі ў надзеі задушыць сваімі драпежніцкімі капцюрамі маладую Савецкую рэспубліку. І вось, у гэты час, выражаючы сваё пролетарскае абурэньне супроць катаў, з прамысловых, заводзкіх і фабрычных нетраў, ішлі ў чырвонагвардэйскія, партызанскія атрады, організоўваліся ў групы, у гурткі моладзі юныя пролетары. Багатае і у той-жа час слаўнае мінулае з барацьбы і работы гэтых груп-гурткоў і па сутнасьці ёсьць пачатак існаваньня і організацыі комсамолу Беларусі. Гэты пачатак, як і ўсю гісторыю комсамолу, які раней складаўся з адзінак, а зараз ператварыўся ў шматмільённую організацыю, павінен ведаць кожны комсамолец.

У сьнежні месяцы 1918 году у радзе гарадоў: Менск, Віцебск, Чэрвень, Мазыр, Бабруйск, Слуцак організоўваюцца першыя комсамольскія ячэйкі. Яны малакольтасны, не замацаваны. Каб павялічыць свае рады і мобілізаваць сілы на абарону рэволюцыі, комсамольцы выпускаюць лістоўкі—адозвы. Вось прыкладна, адозва аднэй ініцыятыўнай групы г. Рэчыцы:

„Таварышы! Каму дорага свабода і шчасьце чалавецтва, усе на сход, усе ў саюз. Рабочая моладзь адгукнецца на заклік пролетарыяту і з моцнай організацыяй комуністычнага саюзу зьнішчыць да шчэнту капіталістычны лад і на яго руінах утворыць свабоднае панаваньне працы. Памятайце-ж, маладыя рабочыя, работніцы і вучні, ваш дабрабыт—у вашых руках. Організуйцеся!“

Нарэшце ў 1919 годзе, 2-га сакавіка быў выдадзены першы нумар часопісу „Факел комунізму“—орган ЦК ЛКСМБ і Літвы. У гэтым нумары, часопісу быў зьмешчаны маніфэст да комсамольскіх організацый... Нам належыць будучае...

Простыя і гарачыя словы маніфэсту натхнялі, узбройвалі пролетарскую моладзь:

„У полымі пажараў, грукаце грымот вялікай расійскай рэволюцыі варадзіўся наш саюз—Комуністычны Саюз Моладзі,—адна частка, адзін лепшых палкоў магутнага Комуністычнага Інтэрнацыяналу...“

І далей:

„Таварышы! Шырокі кругавід вялікія пэрспэктывы адкрываюцца перад намі. Вялікія задачы стаяць перад намі. Нам належыць будучыня. Увесь сьвет павінен быць наш. Мы павінны яго пабудаваць, мы павінны стварыць сваімі мазольнымі рукамі сьветлы—храм новага жыцьця—палац працы. Нам, юным рабочым, якія яшчэ не прасякнуліся атрутай нацыяналізму і шовінізму лягчэй адрачыся ад старога сьвету з яго забабонам і атрэсьці яго прах з нашых ног. Грозная бойка пачалася і цяпер, бойка не на жыцьцё а на сьмерць... Наш абавязак—авангарду рэволюцыйнага пролетарыяту юнакоў у час пасьпець, каб дапамагчы нашым старэйшым братом.“

Адзнак, „Факел комунізму“ праіснаваў нядоўга. Белапольская окупацыя загнала ў глыбокае падпольле комсамол, а разам з ім і яго баявы орган, пасьля выхаду другога нумару. Усё-ж „Факел комунізму“ ня спыняе на гэтым сваё існаваньне. Падпольны цэнтральны камітэт комсамолу, які знаходзіўся ў Менску, рашыў выдаць чарговы, трэці нумар часопісу „Факел комунізму“ з прыпіскаю... „падпольна“, Хутка былі сабраны матар'ялы, нават перадалі друкаваць іх у партыйную друкарню, якая хоць і была прыватнай, але гаспадар яе згадзіўся здаць у арэнду. Быў ужо зроблены набор часопісу, нават прыступілі да друкаваньня. Але раптам... правал. Увесь двор акружаны жандарамі. У кватэрах—вобыскі. Друкары вымушаны былі прыпыніць машыну. Выключылі раму і, не чакаючы прыходу жандараў, рассыпалі ўвесь набор. Надрукаваныя лісткі „Факела комунізму“ трапілі ў печ. Аднак, жандары, апячатаўшы склад на двары, пайшлі, не за-

Мы ўступаем у трэці год соцспаборніцтва

518 і 1040 клічуць на бальшавіцкі, рашаючы штурм

Кожную гадзіну, кожны дзень змагацца за ўдарныя пляны, за тэхніку, тэмпы плюс якасьць

Трымаючы раўненьне па перадавых, падцягваць адстаючых

Калі змываюць плямы

Гэта было у пачатку сакавіка.

Праз вузкі калідор заводу імя Варашылава, у чорных замазаных блюзах, зьбіралася на сход комсамолія.

Падводзіліся вынікі выкананьня прамфінпляну за люты месяц. У цэнтры увагі была комсамольская брыгада на цэнтравальных варштатах, якая выканала прамфінплян на 28 проц.

„Няхай гэтых комсамольцаў судзіць увесь сход“,—гаварыў сэкратар колектыву.

І пачаліся спрэчкі.

Выкрывалі карэньні прарываў: адсутнасьць працдысцыпліны ў брыгадзе, няправільная расстаноўка сіл рэяны вучот працы.

Мінуў месяц. Ганебная пляма змыта. Замест адсталай брыгады нарадзілася ўзорная комсамольская комуна імя „Чырвонай Зьмены“.

Дзесяць комсамольцаў - ударнікаў сваёй энэргіяй, сваёй дружнай працай паказваюць усяму рабочаму колектыву сапраўды бальшавіцкія тэмпы.

Гурвіч і Ігнатоўскі—брыгадзір і загадчык брыгады—праваднікі тэхнічных ведаў. Ігнатоўскі ведае сваю справу, свой варштат і перадае свае веды ўдзельнікам комуны.

„Кожны з нас павінен стаць тэхнікам сваёй справы“—кажа загадчык Ігнатоўскі і брыгада стварыла свой тэхнічны гурток.

Сакавік даў 180 проц. выкананьня прамфінпляну.

У брыгады свой аднаначальнік —Ігнатоўскі. Ён расстаўляе сілы, ён сочыць за выдаткаваньнем матар'ялу. Брыгада высунула у красавіку свой сустрэчны плян на 30 варштатаў замест 25.

Расьце комуна, а з ёю і энтузіязм комунараў. Іх было 8,—зараз 10. Усе як адзін і кожны як ўсе.

С. Окунеў і С. Гурвіч

У першых радох соцыялістычнага будаўніцтва

Яны ў першых радох. Іх шмат.

На працягу аднаго месяцу напярэдні 2-й гадавіны соцыялістычнага спаборніцтва мы паказалі тых, што ідуць наперадзе: за тэмпы, за якасьць за прамфінплян, за 5-цігодку ў 4, у 3, у 2 з палов. гады.

Прад намі прайшлі тыя, аб якіх

„тэлефон прынёс зьвестку... Прамфінплян на кравецкай фабрыцы імя Валадарскага выкананы 28-II, а 9 гадзіне ўвечары“,

„Штаб ударнага маладзёжнага агрэгату“.

А за штабам... сотні ўдарнікаў, варштатаў, герояў нашых будаўнічых дзён.

„Ударная брыгада па рамонту цягнікоў дэпо—Гомель“. Адрамантаваныя брыгадай цягнікі не патрабуюць праверкі—надзейныя.

А колькі брыгад у Жлобіне. у Менску... на кожным цягніку, у кожным дэпо.

„Ударнікі цэхаў вучобы“ ударнай вучобай даюць ударныя тэмпы ў падрыхтоўцы кадраў, а заўтра будуць ударнікамі нашай будоўлі.

Гэта радавыя барацьбіты.

Барацьбіты перадавых калён ударных палкоў 5-ці годкі.

Палкі ідуць.

За два гады барацьбы за соцыялістычныя формы працы ўдарнікі далі геройчныя прыклады працы ля варштатаў.

Гэтая геройка нашых будняў моцна, непераможна тым, што яна абыдзеная, што геройка будаўніцтва вышла, магутна разраслася з нэтраў мас саміх будаўнікоў.

Фактаў геройчнай барацьбы на гаспадарчым фронце—безьліч.

Таму яны даюць перамогу. Таму 5-цігодка ня ў 5, а ў 4, 3, у 2 з паловай гады.

Два гады дзеяньня ленінскай ідэі соцыялістычнага спаборніцтва прынесьлі перамогу цэхам.

Цэхі ідуць да новых перамог у 3-м годзе соцыялістычнага спаборніцтва. Яны ідуць. Яны растуць брыгадамі ўдарнікаў. Таму яны непераможны. Таму перамогуць яны.

Ленінскі комсамол, ініцыятар соцыялістычнага спаборніцтва, аказаўся ў першых яго радох, у штодзённай барацьбе.

Ленінскі комсамол на вытворчасьці—гэта ўдарная брыгада, агрэгаты, цэхі.

Комсамол—актыўны, непасрэдны ўдзельнік гаспадарчага жыцьця вытворчасьці.

Комсамол пад кіраўніцтвам Ленінскай Комуністычнай партыі вядзе рабочую моладзь у рады перадавых барацьбітоў да новых перамог на фронце соцыялістычнага будаўніцтва.

Да новых перамог у 3-м годзе соцыялістычнага спаборніцтва!

... Сёньня 247 ударнікаў

Машына-будаўнічы завод „Камунар“ (Менск) да другой гадавіны соцспаборніцтва прыходзіць з вялікімі дасягненьнямі на фронце барацьбы за выкананьне прамфінпляну.

759 ударнікаў, 689 лепшых рабочых закантрактаваных да канца 5-цігодкі, 7 вытворча-бытавых комун, адзін вытворча-бытавы колектыў, пяць ударных, 3 скразныя брыгады, 4 брыгады паказальнай якасьці, плянава-опэрацыйныя групы—наш баланс.

У выніку бальшавіцкага змаганьня за пасьпяховае перавыкананьне прамфінпляну завод атрымаў ганаровы пераходны сьцяг імя ЦК ЛКСМБ.

Да 2-й гадавіны соцспаборніцтва організуюцца чатыры ўдарных комсамольскіх брыгады.

Комсамольскія брыгады заключаюць паміж сабою ўмовы соцспаборніцтва на лепшае выкананьне прамфінпляну. Брыгады кавальна-цісачнага цэху заключылі дагавор з адміністрацыйна-тэхнічным пэрсаналам па якому яны абавязаліся ліквідаваць брак, цалкам зьнішчыць прагулы і спазьненьні, рацыянальна скарыстоўваць нормы вугалю і нафты і г. д.

Адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал з свайго боку абавязваецца своечасова падаваць матар'ял, плянава-рацыянальна скарыстоўваць рабочую сілу ў цэху, дапамагчы рабочым рэалізаваць пачынаньні як рысоўня прапановы і падняць тэхнічны ўзровень. Давесьці да кожнага гарна, да кожнай брыгады дзённую выпрацоўку як таварнай прадукцыі, так і ў грошах. Брыгады пераведзены на гаспадарчы разрахунак.

Комсамольцы ў параўнаньні з мінулым годам прымаюць значна большы ўдзел у соцспаборніцтве. Калі ў мінулым годзе комсамольскі колектыў быў ахоплены соцспаборніцтвам на 60 проц., дык у гэтым годзе з 260 комсамольцаў 247 ударнікаў.

Г. Фрыд.

* * *

Соцыялізм ня толькі не загашвае спаборніцтва, а наадварот, упяршыню стварае магчымасьць ужыць яго сапраўды шырока, сапраўды ў масавым размеры, уцягнуўшы сапраўды большасьць працоўных на арэну такой работы, дзе яны могуць выявіць сябе.

(Ленін)

* * *

Ленінскі комсамол і рабочая моладзь, якою ён кіруе, увенчваюць справу спаборніцтва і ўдарніцтва рашаючымі посьпехамі. Трэба прызнаць, што наша рэволюцыйная моладзь адыграла ў гэтай справе выключную ролю.

(Сталін)

Спаборніцтвам не аўладалі

Менскі політэхнікум Сувязі да 2-й гадавіны соцспаборніцтва прыходзіць з вялікімі прарывамі ў галіне выкананьня вучэбнага пляну. Такія дысцыпліны, як тэхналёгія металяў, ваенізацыя знаходзяцца пад пагрозай невыкананьня.

Ударныя брыгады па вучобе працуюць слаба, бо партыйная, комсамольская ячэйкі і профком штодзён на ня кіруюць імі. Большасьць брыгад працуе без пляну і толькі ў клясе.

Р. М.

ПРЫШЛІ З УДАРНЫМІ

У наборным, машынным, пераплётным хваля соцспаборніцтва і ўдарніцтва расла з кожным днём. Ударнымі брыгадамі ішлі рабочыя да варштату.

Да першай гадавіны соцыялістычнага спаборніцтва ў наборным аддзяленьні была адна брыгада. А зараз?

Зараз у наборным 5 ударных брыгад і 1 вытворчая комуна.

Увесь комсамол ударная брыгада.

Творчы ўздым расьце. У сьвята, у юбілейны дзень, у час праверкі соцспаборніцтва, сьвядомасьць рабочыя мас афармляецца ў новыя ўдарныя брыгады.

Рабочы цэхаў соцыялістычнай будоўлі ня можа. ня хоча, працаваць па-былому. Сёньня праца толькі ўдарная.

Вышэйшыя формы соцыялістычнага спаборніцтва, комуністычнае працы прышлі ў цэх вытворча-бытавой комунай.

Старонкі газэт, кніг, брошур, што клічуць штодзень да ўдарнай працы, набіраюцца ўдарным парадкам.

Ударнымі брыгадамі друкуюцца, пераплятаюцца.

Рабочыя „сталінцы“ з гонарам, ударнымі брыгадамі прышлі да 2-й гадавіны соцыялістычнага спаборніцтва.

А.

Несьлі запал на фронты

Комсамольцы, ня гледзячы на ўзмоцненую дзейнасьць шпікаў, провокатараў, з асаблівым ухітрэньнем друкавалі на рататорах, шапірографах і іншых прымітыўных друкарках іх пракламацыі, лістоўкі, адозвы, прокламацыі і распаўсюджвалі іх сярод мас працоўнае моладзі.

„Рабоча-сялянская моладзь, окупаванай белапалякамі Беларусі—слухай: ужо больш 10-ці месяцаў, як на шыі рабочых і працоўнага сялянства сядзяць польскія паны. Няхай загрыміць па ўсёй Беларусі, даволі цярпець!“

Насычаныя класавай нянавісьцю барацьбай гэтыя лістоўкі,—адозвы клікалі масы працоўнай моладзі да рашучых новых сутычак з найміта[мі] сусьветнага імпэрыялізму, організоўвалі, гуртавалі іх вакол комуністычнага партызанскага руху, заклікалі на апошні і рашучы бой з тымі, хто сваім ботам хацеў задушыць маладую чырвоную Савецкую рэспубліку.

Зарадку, рэволюцыйнае натхненьне гэтых адозваў, рабочая і працоўная моладзь несьлі на фронты, у партызанскія атрады, якімі былі запоўнены лясы Беларусі. Партызанскія атрады пераважна складаліся з моладзі. Яны ўзрывалі масты, парывалі тэлеграфную сувязь, нападалі на ваенныя абозы, адбіралі ў іх вайсковую амуніцыю і зброю, наносілі ўдары белапалякам у тылу, разьбіралі чыгуначныя рэйкі, спускалі цягнікі пад адхон. І, дзякуючы мобілізацыі ўсіх сіл, дзякуючы геройчнай барацьбе Чырвонай арміі, партызанскім атрадам пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі, прагналі ўсіх, што захапілі Савецкую Беларусь, белапольскія банды ліквідаваны.

Трымаць порах сухім

1920 год—год выключнай разрухі і, ня гледзячы ні на што,—год вялікіх перамог пролетарыяту, гэта быў рашаючы год у гісторыі комсамолу Беларусі.

22-га жніўня г.г. пачала выходзіць газэта „Моладзь Беларусі“ орган ЦК комсамолу Беларусі.

Але вышла ўсяго тры нумары. Лозунг апошняга нумару гэтай газэты, у адказ на новае наступленьне белапалякаў, быў: „Рэзэрвы, у бой!“ „Усё для перамогі, ні адной секунды для адпачынку!“..

У верасьні 1920 г. быў скліканы першы ўсебеларускі зьезд комсамолу. Для працы зьезду былі зусім ня спрыяючыя ўмовы. У гэты час шалёна разьвівалася наступленьне польскай арміі. Многія організацыі не змаглі абраць дэлегатаў. Прадстаўнікі ад паасобных організацый зацьвярджаліся дэлегатамі мандатнай камісіі на зьезьдзе без выбараў.

Палажэньне надыходзіла вельмі хутка. Значная частка дэлегатаў пасьля зьезду ня мела магчымасьці вярнуцца ў свае організацыі, бо іх тэрыторыя занята была белапалякамі. Гэтыя вайсковыя выпадкі, безумоўна, не маглі не адбіцца на работах зьезду. Пытаньні разглядаліся насьпех. Аднак дэлегаты высунулі настойлівую прапанову выдаваць спэцыяльную рэгулярную комсамольскую газэту.

І толькі ўжо 21-га красавіка 1921 году, у час работ другога Усебеларускага зьезду комсамолу, вышаў першы нумар комсамольскай газэты „Чырвоная Зьмена“.

Газэта, бяручы на сябе вялікія абавязкі, так вызначала ў гэтым нумары свой дэвіз:

„Моладзь—загартаваны атрад рэволюцыі—павінна быць моцнай, сплачонай для таго, каб стаць дастойнай зьменай—„старшим в борьбе уставшим“. „Чырвоная Зьмена“ пакажа моладзі шляхі, па якіх яна дойдзе да „земли обетованной“, калі „владыкой мира будет труд“. „Чырвоная Зьмена“ будзе клікаць моладзь на работу, на барацьбу за ідэалы комунізму, будзе дапамагаць ёй“...

Гэты шлях і задачы „Чырвоная Зьмена“ як орган ЦК ЛКСМБ, разьлічаны на шырокія масы працоўнае моладзі, з выхадам кожнага нумару замацоўвала. Улічваючы прымежнасьць Беларусі з капіталістычным Захадам, „Чырвоная Зьмена“ па-баявому, з першых-жа нумароў, мобілізуючы ўвагу мас, заклікае пролетарскую моладзь; „быць на-чаку“. „Вораг ня дрэмле“, „трымаць порах сухім“.

* * *

Пераход на НЭП, пачатак аднаўленчага пэрыоду засьцiглі „Чырвоную Зьмену“, калі яна толькі формавалася. Мітынгоўшчына, агіткі, ваенная ліхаманка пачалі замяняцца настойлівай і ўпартай работай. Спачатку было шмат недарэчнасьцяй. Частка комсамольцаў і рабочае моладзі не зразумела важнасьці ўвядзеньня НЭПу. Зьявіліся панічныя настроі, пэсымізм, нявер'е ў нашы сілы. Аднак, газэта своечасова вызначае сваё пэўнае месца, уключаецца ў вырашэньне актуальных задач партыі па аднаўленьню разбуранай народнай гаспадаркі. Газэта правільна і своечасова ставіць пытаньне аб узмацненьні ўдзелу комсамольскай організацыі на ўсіх вучастках гаспадарчага будаўніцтва. Шырока разгортваецца экономічная работа комсамолу. Разгортваецца бытавая, адукацыйная, выхаваўчая і тэорэтычная работа комсамольскай організацыі,—усё гэта газэта адлюстроўвае на сваіх старонках. рашуча ставіць пытаньне аб барацьбе за генэральную лінію партыі, завастрае пытаньне аб удзеле комсамольскай організацыі ў нацыянальна-культурным будаўніцтве.

Аэ.



На ўвесь завод адзінкі рабкораў

Завод „Бальшавік“ мае шматтыражку „Рабочае вока“ і чатыры насьценгазэты, у якіх моладзь заводу зусім не ўдзельнічае.

За гэта гаворыць той факт, што комсамольская старонка пры шматтыражцы, якая павінна была выходзіць кожны месяц, вышла ўсяго 2 разы за ўвесь 1930 год, у ліпені і сьнежні месяцох.

Комсамольскі колектыў на разгортваньне юнкораўскага руху ніякай увагі не зварочвае. У завадзкім друку ўдзельнічае ўсяго 10 рабкораў і некалькі чалавек вусных карэспондэнтаў.

Таксама нікуды ня варта абстаіць справа з працай насьценгазэт, якія выходзяць нерэгулярна.

Брыгада „Ч. З.“ Шэвелеў і Агароднік

Прасякнуць кожны газэтны радок барацьбой за выкананьне трэцяга рашаючага году

У дзень 10-гадовага юбілею—бальшавіцкае прывітаньне „Чырвонай Зьмене“

„Зьвязда“ шле бальшавіцкае прывітаньне баявому органу ЦК ЛКСМБ—„Чырвонай Зьмене“ ў дзень 10-гадовага юбілею.

10 год „Чырвонай Зьмены“—10 слаўных старонак у гісторыі комсамолу Беларусі. Разам з ростам комсамолу расла і газэта. Ад „Краснага Факела“, які заклікаў моладзь Беларусі на барацьбу з белапольскімі акупантамі, да „Чырвонай Зьмены“—баявой газэты, якая пад кіраўніцтвам ЦК ЛКСМБ і ленінскай партыі змагаецца за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі, за соцыялістычную рэканструкцыю народнай гаспадаркі, за пабудову фундаманту соцыялістычнай экономікі.

Уступаючы ў 11 год свайго існаваньня, „Чырвоная Зьмена“ павінна яшчэ больш прасякнуць політычным зьместам кожны радок у газэце, узмоцніць барацьбу з правым і „левым“ ухіламі ад генэральнай лініі, з прымірэнцамі, з праявамі вялікадзяржаўнага шовінізму, нацыянал-дэмократызму і шовінізмамі іншых колераў. „Чырвоная Зьмена“ павінна шырэй асьвятляць на сваіх старонках жыцьцё і барацьбу комсамолу капіталістычных краін, павышыць работу па інтэрнацыянальным выхаваньні рабочай моладзі, палепшыць масавую работу сярод юнкораў, весьці ўпартую барацьбу за пасьпяховае выкананьне пляну трэцяга, рашаючага году пяцігодкі, за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

„Зьвязда“

Выклік прымаю

Да 10-цігадовага юбілею „Чырвонай Зьмены“ Слуцкая організацыя комсамолу дае шмат новых падпісчыкаў на „Чырвоную Зьмену“.

Слуцкі Белпэдтэхнікум абавязваецца завербаваць падпісчыкаў на 700 экз. „Чырвонай Зьмены“. Упаўнаважаныя „Ч. З.“ абвясьцілі сябе ўдарнікамі кожны і склалі міжсобку соц. умову. Слуцкі Белпэдтэхнікум выклікае на соцспаборніцтва Слуцкую профтэхшколу і 1-шую аб'яднаную 7-мігодку.

Профтэхшкола выклік тэхнікуму прымае і бярэ на сябе абавязак завербаваць 200 падпісчыкаў на „Ч. З.“, разам з тым выклікае пасьлядаваць свайму прыкладу школу колгаснае моладзі і 2-ю сямігодку.

1-ая аб'яднаная сямігодка выклік тэхнікуму прымае і бярэ на сябе абавязак завербаваць 300 падпісчыкаў на „Ч. З.“, выклікаючы на спаборніцтва 1-ю аб'яднаную лурэйскую сямігодку.

Школа колгаснай моладзі выклік профтэхшколы прымае і бярэ на сябе абавязак распаўсюдзіць не менш 60 экз. „Чырвонай Зьмены“, выклікае на соцспаборніцтва Лучнікоўскую сямігодку.

Вяроўка.

Ад юнкораўскай працы—на адказную работу ў рэдакцыі

За сваё 10-цігадовае існаваньне газэта „Чырвоная Зьмена“ цьвёрда змагалася за правядзеньне ў жыцьцё генэральнай лініі партыі.

„Чырвоная Зьмена“ на сваіх старонках выхавала сотні юнкораў, якія вылучаліся на другую адказную працу. Бяру прыклад з сябе. Я, юнкор „Ч. З.“, спачатку вусім не мог пісаць у газэту. Толькі дзякуючы „Ч. З.“ я выхаваўся добрым юнкорам. Зараз я вылучаны ў рэдакцыю раённай газэты ў якасьці сакратара.

Неабходна, каб „Чырвоная Зьмена“ трымала яшчэ большую сувязь з юнкорамі і вылучэнцамі і дапамагала-б ім у іхняй працы.

Протчанка З.

Наш падарунак юбіляру

У адзнаку 10-цігадовага юбілею „Чырвонай Зьмены“ комсамольскі колектыў Віцебскай акулярнай ф-кі організаваў 2 вытворчыя брыгады імя юбілею „Чырвонай Зьмены“ ў падрыхтоўчым і зборачным цэху. Павялічана падпіска на 60 экз.

У ячэйцы № 3 організавана юнкораўская маладзёжная брыгада ў складзе Бахнава, Гольдзіна, Эйдэльмана, Цынмана, Гольдзінай М і Розы Цвой.

Р. Ц.

Бяру на сябе абавязак

Я, комсамолец колгасу „Зялёная Рошча“ бяру на сябе абавязак распаўсюджваць сярод комсамольцаў і беспартыйнай моладзі ў адзнаку 10-цігадовага юбілею, ня менш 50 экз. „Чырвонай Зьмены“.

Выклікаю наследаваць майму прыкладу ўсіх комсамольцаў колгаснікаў Прыханскага с-савету.

Гарбачаўскі А.

Дабіцца ня менш 500 экз

Дагэтуль у Вушацкім раёне распаўсюджваецца ўсяго 250 экз „ЧЗ“. Гарадоцкая, Чарнаўшчынская і Весьніцкая ячэйкі не выконваюць разьвярсткі па выпісцы „ЧЗ“ дадзенай Р... комсамолу. Кантрольнае заданьне ня выканана па раёне на 300 экз.

Апошні сход месячковых (Вушачы) ячэек, заслухаўшы інформацыю аб сьвяткаваньні 10-цігадовага юбілею „Чырвонай Зьмены“ абвясьціў сябе ўдарным у распаўсюджваньні баявой газэты „Чырвоная Зьмена“ і ўзяў абавязак выканаць заданьне па масточку з перавышкай замест 50 экз. выпісаць 100.

Пленум РБ ЛКСМБ, заслухаўшы інформацыі сакратара аб падрыхтоўчай працы да юбілею, прыняў пастанову: замест выпіскі 250 экз. „Чырвонай Зьмены“, на бліжэйшы час дабіцца 500 экз.

Гінзбург. Я.

Гатункі раньняй бульбы і іх культура

Пытаньне забясьпечаньня гарадзкіх рабочых цэнтраў бульбай і асабліва бульбай раньніх сартоў у павестцы дня і можа быць вырашана даволі лёгка пры належнай адпаведнай увазе гэтаму пытаньню. Як корм для жывёлы і асабліва для сьвіней, бульба займае таксама адно з галоўнейшых месц сярод другіх кармавых расьлін. Прыгатаваны на корм можа і павінен быць скарыстаны і бульбоўнік, які прайшоў праз сілос. Як тэхнічная культура на ўмовах БССР бульба займае таксама адно з цэнтральных месц.

РАНЬНІЯ ГАТУНКІ

Найлепшымі раньнімі гатункамі для нашых умоў зьяўляюцца „Эпікур“ і „Раньняя Роза“, абодва гатункі вельмі смачныя, досыць ураджайныя і найбольш прыдатныя для раньняй выгадоўкі з мэтай забясьпечаньня гарадзкіх рабочых цэнтраў.

ДЗЕ ТРЭБА САДЗІЦЬ РАНЬНЮЮ БУЛЬБУ?

Апроч спэцыяльна адведзенага месца, лепш за ўсё выкарыстаць папар. Ня трэба даводзіць, кожны комсамолец і так ведае, што пакідаць папар не занятым, як гэта рабілася да апошняга часу, зусім нявыгадна і што найлепей займаць папар раньняй бульбай, альбо віка-аўсянай мешанінай, што ў большасьці выпадкаў ужо робіцца ў саўгасах і колгасах.

Раньнюю бульбу можна сеяць на ўсякіх глебах, у тым ліку і на пясчаных, аднак поле трэба угноіць, прычым унесенае угнаеньне будзе мець уплыў ня толькі на ўраджай бульбы, а і на наступныя азімыя культуры.

Пасадку раньняй бульбы трэба рабіць па магчымасьці раней у праветраную і прагрэтую сонцам глебу.

Пасаджаны матар'ял трэба захоўваць ад таго, каб ён не перамяшаўся з другімі гатункамі. Перад пасадкаю насеньне трэба добра прасушыць. Псаваныя, альбо загніўшыя клубні саджаць ня можна.

СТАЛОВЫЯ ГАТУНКІ

Апроч вышэй паданых раньніх сталовых гатункаў, якія павінны ісьці на забясьпечаньне рабочых цэнтраў вясною і ў пачатку лета, трэба мець гатункі для зімовага і раньняга веснавога часу. Гэтыя гатункі павінны быць смачныя, найменш псавацца пры захоўваньні, добра ўраджайныя і г. д. Такім умовам адпавядаюць: Сілезія, якая вельмі распаўсюджана ў БССР, Сьвіцязь і Рублёўка, або, як яе называюць,—народная. Апошняя прыгодна для сталовага і кармавога ўжытку.

Усе гэтыя гатункі белаклубянныя досыць гладкія, высокрахмалістыя і ўраджайныя, устойлівыя супроць хваробаў і моцныя ў лёжцы. Раяцца яшчэ і другія гатункі, але яны ў большасьці выпадкаў, або мяней ураджайныя, або лёгка гніюць.

КАРМОВЫЯ ГАТУНК…

Як і сталовыя, кармовыя гат… павінны быць смачныя, высока… джайныя, добра захоўвацца і … тым умовам адпавядаюць … лезія, Сьвіцязь і Рублёўка.

Раяцца таксама гатунак Круг… Рэйтман (вельмі блізкія паміж сабо…) аднак відавочна, што Кругер вельмі… рэе мазаікай (хваробай выраджэ…) ад чаго вартасьць гатунку ве… зьніжаецца. Захварэўшы матар'ял … можна пакідаць на насеньне бо і… ураджай яго будзе катастрофічна … даць. Як кармовы гатунак, можа … раіць таксама Турчанка (Ружова… Мілету). Для сярэдніх глеб прыга… ці Багатырка, дзе такі гатунак рас… сюджан.

ЗАВОДЗКІЯ ГАТУНК…

Найлепшым заводзкім гат… які зьяўляецца гатунак Во… мін, які на 10-12 проц. засмечан… і іншымі гатункамі, але не хварэе ні… хворасьцямі (па-першае мы вельмі… дакладна ўстанавіць якія рась… зьяўляюцца прымешкамі і якія ня… жаць да асноўнага гатунку. Для … мэты карыстаемся прыемам апро… тара, з дапамогай якога ўстанаў… якія гатункі на даным полі зьяўл… ца прымешкай. Для азначэньня гат… каў існуе шмат рад кніжак, якімі м… карыстаемся. …ку М. Лапаціна „Вызначальнік гат… каў бульбы“ …

АБ АПРАЦОЎЦЫ ГЛЕБ… ПАД БУЛЬБУ

Бульба любіць лёгкія супяшчан… і суглінкістыя глебы, а таксама … дрэнна родзіць і на пясчаных і… добра ўгноеных глебах. Ня любі… мокрых нізін і западзін, дзе … гаі сядзейнічае развіцьцю розных бульбяных хвароб…

Бульба любіць пульхную, до… апрацаваную глебу. Апрацоўку … пад бульбу трэба пачынаць з … даючы глыбокую ўзорку на глыбі… 18-20 сантымэтраў. Увесну пажада… зрабіць больш дробную ўзорку 10-13 сант. Калі-ж гэтага зрабі… нельга, тагды як мага раней трэ… поле баранаваць, найлепш спрунж… ноўкай.

Дзямідовіч.

На соцыялістычнай вахце

„Дзень друку“—гэта масавы агляд бальшавіцкай прэсы, самая шырокая праверка таго, як друк спраўляецца з сваімі задачамі на сучасным этапе соцыялістычнага наступленьня.

У гэтым годзе партыя паставіла перад друкам асабліва адказныя задачы: перабудаваць усю сваю работу на пачатках опэрацыйнасьці, стаць сапраўдным організатарам мас, злучаючы задачы організацыі з прапагандай баявых лёзунгаў партыі. Менавіта пад знакам выкананьня гэтых запатрабаваньняў ішло разьвіцьцё друку за апошні час. І трэба сказаць, што тут ужо дасягнуты сур'ёзьнейшыя посьпехі. Магутнае разгортваньне пролетарскай самакрытыкі, заваёва новых пластоў чытачоў, організацыя бальшавіцкай опэрацыйнасьці, настойлівая і рашучая барацьба супроць наскокаў правых і „левых опортуністых на партыю і яе кіраўніцтва,—вось з якімі паказчыкамі выходзіць наш друк на агляд.

Гэткі-ж шлях перабудовы і асваеньня новых, якасна больш высокіх задач прарабіў і друк комсамолу—адзін з важнейшых атрадаў савецкай прэсы.

Але задачы далейшай перабудовы ўсяго друку, у тым ліку комсамольскага, ніколькі ня здымаюцца з абвесткі дня. Наадварот, цяпер яны павінны быць асабліва падкрэсьлены.

Перад друкам комсамолу трэба паставіць ва ўвесь рост задачу асваеньня слаўных традыцый бальшавіцкае прэсы. У цяжкіх умовах, падпарадкуючыся драконаўскім рэпрэсіям з боку дзяржымордаў царскага ладу, наша партыя будавала свой масавы друк. Пасьля Кастрычніка гэты друк стаў нябачана разьвівацца. Асноўная ўласьцівасьць бальшавіцкае прэсы, гэта—цясьнейшая сувязь з масамі, яе вялізарная організатарская роля. Гэтай уласьцівасьцю ў поўнай меры павінен ўладаць і друк комсамолу. Тут мы ўжо дасягнулі пэўных посьпехаў.

Такія вучасткі, як кіраўніцтва юнкораўскім рухам, сапраўды конкрэтна-опэрацыйнае асьвятленьне рознастайнай гаспадарча-політычнай работы комсамолу—далёка яшчэ не пастаўлены на належную вышыню.

Звычка „працаваць наогул“ моцна ўкаранілася нават у такі гнуткі і рухавы апарат, якім зьяўляецца газэта. Вось чаму выгнаць супольнае, цалкам і неадкладна аўладаць мэтодамі конкрэтна-опэрацыйнай работы—першачарговая задача комсамольскага друку.

Зразумела, што опэрацыйнасьць павінна разумецца, як злучэньне „вялікага ідэйна-політычнага размаху з уменьнем організоўваць масы рабочай і працоўнай моладзі на выкананьне паасобных конкрэтных задач“ (9-ты зьезд УсеЛКСМ). Гэта значыць, што патрэбна ня проста штодзённае асьвятленьне пэўнага вузлавога пытаньня. Гэтага яшчэ мала. Патрэбна такое асьвятленьне, якое, бічуючы недахопы, вучыла-б работніка, паказвала як трэба працаваць, абагульвала лепшы вопыт, пасьлядоўна ставіла новыя задачы. Адсюль ясна, што опэрацыйнасьць немагчыма без пропаганды, без паказу лепшых прыкладаў і ўзораў. Гвоздь опэрацыйнасьці—гэта тэмпы плюс якасьць, плюс праверка выкананьня.

Праверка выкананьня ў комсамольскім друку і ва ўсім Саюзе—вострая, баявая проблема. Каму невядома, што дзесяткі каштоўнейшых пачынаньн ў тэй ці іншай газэты пакрываліся пылам забвеньня толькі таму, што, высунуўшы гэтыя пачынаньні, газэта больш да іх не варочалася. Гэта, так сказаць, унутрыгазэтная праверка выкананьня. Ня лепш пакуль што справа з організацыяй праверкі выкананьня ў ячэйках і камітэтах. Друк не заняў неабходнага месца ў вырашэньні гэтай важнейшай проблемы комсамольскага кіраўніцтва. 9-ты зьезд даў дырэктыву: „Саюз павінен шырэй і актыўней разгарнуць сваё ўдзельнічаньне ў саўбудаўніцтве, плянаваньні, рацыяналізацыі і асвоеньні новай тэхнікі“. Гэта патрабуе ад усяго кіраўніцтва, у прыватнасьці ад кадраў друку, узброеньня тэхнікай, веданьня экономікі свайго краю раёну. Бяз гэткага ўзброеньня немагчыма выгнаць супольнасьць, немагчыма організацыя конкрэтнага кіраўніцтва ў саюзе. Чарговай задачай, побач з падвышэньнем удзельнай вагі, укараненьнем элемэнтаў тэхнікі ў нашу газэту, пропагандысцкімі матар'яламі наогул, зьяўляецца цяпер організацыя ў ёй кутка тэхнічнай консультацыі, зьмяшчэньне артыкулаў спэцыялістых па паасобных пытаньнях. Менавіта таму стварэньне вакол газэт кадраў прапагандысцкага актыву, гаспадарнікаў, спэцыялістых—справа, якая ня можа быць адкладзена.

Разам з гэтым, выключна актуальна задача ўцягненьня ў работу газэт лепшых ударнікаў, пашырэньня радоў юнкораў, організацыя іх работы на аснове брыгаднага мэтоду.

Вырашаючы вузлавыя задачы соцыялістычнай рэконструкцыі, газэта павінна ўмець знаходзіць асноўнае зьвяно дапасоўна да экономікі сваёй галіны. Тут у нас далёка ня ўсё добра. Зусім нядаўна адзначаліся такія „пропускі“ як, напрыклад, газэты раёнаў завяршэньня суцэльнай колектывізацыі слаба боруцца за колгасы, газэты ільнаводных раёнаў бязьдзейнічаюць у справе кантрактацыі ільнапасеву і г. д.

У самай цеснай сувязі з гаспадарчымі задачамі трэба ставіць пытаньне ўнутрысаюзнага будаўніцтва, асабліва рост комсамолу, выкананьне лёзунгу 9-га зьезду аб пераўтварэньні комсамолу ў шматмільённую організацыю, політ-асьвета, перабудова саюзнага кіраўніцтва.

Груба памылковым зьяўляецца паслабленьне ўвагі да ўнутрысаюзных пытаньняў, якія наглядаюцца ў некаторых газэтах.

Вось сума задач, якія з найвялікшай выразнасьцю абавязан паставіць перад сабой комсамольскі друк, у сувязі з правядзеньнем „дня друку“.

Далейшы рост у ўмацаваньне комсамольскіх газэт і часопісаў не падлягае ніякаму сумненьню. Гэты рост павінен і будзе праходзіць пад знакам бязьлітаснай барацьбы на два франты, за ленінскую партыю, за соцыялізм.

Пад пільным кіраўніцтвам партыі наш друк будзе цьвёрда стаяць на соцыялістычнай варце.

Андрэеў.

Папраўка

Ва ўчарашнім № газ. „ЧЗ“ па віне карэктуры, ў перадавой „Перад рашаючым выбарам“ надрукавана: „... Ці капіталістычная анархію і крызысы—ці выключаючая анархія і крызысы соцыялістычная сыстэма гаспадаркі“.

Трэба чытаць: „... Ці капіталі…тычная анархія і крызысы—ці вы…ключаючая анархію і крызысы с…цыялістычная сыстэма гаспадаркі…

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТА…

Друкарня імя тав. Сталіна.

Галоўлітбел № 599.